# Кабінет савецкага пісьменніка



У Гомельскай цэнтральнай гарадской бібліятэцы імя Аляксандра Герцэна пачала дзейнічаць новая экспазіцыя Музея аўтографа — «Кабінет пісьменніка». У аснову экспазіцыі пакладзена прыватная бібліятэка пісьменнікаў Сяргея і Галіны Масіяшаў. Сяргей Паўлавіч — член Саюза расійскіх пісьменнікаў, лаўрэат прэміі імя В. Пікуля, аўтар серыі вядомых гістарычных раманаў і аповесцяў («Аляксандр Неўскі», «Слуга сямі цароў», «Адысея Бацькі Махно» і інш.). Галіна Фёдараўна — дзіцячая пісьменніца (творчы псеўданім Галіна Фёдарава).

Сяргей і Галіна Масіяшы — унікальны сямейны творчы тандэм. На працягу многіх гадоў яны сябравалі з бібліятэкай імя А. Герцэна, тут адбываліся прэзентацыі іх новых кніг і юбілейныя вечарыны. Пасля смерці Сяргея Паўлавіча Галіна Фёдараўна падаравала бібліятэцы кнігі, сабраныя разам з мужам, — 589 экзэмпляраў розных выданняў. Кнігі Масіяшаў сталі бібліятэкай у бібліятэцы. Экспазіцыя, афармленая як кабінет пісьменніка, дазваляе не толькі пазнаёміцца з прыватнай бібліятэкай пісьменнікаў і сферай іх зацікаўленняў, прасачыць этапы працы па напісанні гістарычных раманаў Сяргея Масіяша, але і адчуць атмасферу савецкай эпохі і тагачаснага літаратурнага працэсу. Адкрыццё выстаўкі было прымеркавана да дзевяностагоддзя з дня нараджэння Сяргея Масіяша.

**Юлія ШПАКОВА**